Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ГАЛОЎНАЕ КІРАЎНІЦТВА
АДЗІНАЙ ГІДРА-МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЙ СЛУЖБЫ
пры НКЗ БССР

ДЭКАДНЫ БЮЛЕТЭНЬ ГІДРА-МЭТІНСТЫТУТУ

Адрас рэдакцыі: Менск, Шырокая 28. Гідра-мэтэоролёгічны Інстытут.
Тэл. 21877 і 23280.

№ 11 (124) | 11—20 красавіка | 1933 г.

ЗЬМЕСТ

СЫНОПТЫЧНЫ АГЛЯД

за 1—20 красавіка 1933 г.

На працягу першае дэкады красавіка Эўропейская тэрыторыя Саюза знаходзілася ў сфэры цыклёнічнай дзейнасьці ў выніку праніканьня праз Балтыку шэрагу цыклёнічных цэнтраў полярна-франтовай сэрыі.

Характэрнай асаблівасьцю разьвіцьця процэсаў было тое, што ў гэты пэрыод часу арктычны фронт аказваецца вельмі ссунутым на паўночную трэць Эўропейскай тэрыторыі Саюза, маючы орыентыроўку з усходу на захад: наогул ён мае кірунак ад паўночнага Урала на Балтыцкае мора і Скандынавію.

Такое становішча прыводзіла да рэгенэрацыі цыклёнічных цэнтраў на арктычным фронце ў час іхняга руху па тэрыторыі Саюза з пасьлядоўнымі прарывамі марскога арктычнага паветра у прыватнасьці са Скандынавіі на заходнія часткі Саюза і сумежныя краіны Заходняй Эўропы.

У другую палову дэкады ствараецца абшырная дэпрэсія ў выніку далучэньня да сыстэмы паўночна-заходняга паходжаньня, цыклёну з Касьпійскага мора.

Тэрыторыю БССР першыя тры дні дэкады займала параўнальна цёплае марское, полярнае паветра, струмень якога пра-

Табліца вынікаў мэтэаролёгічных

	№№ па карце	Назва станцый	Тэмпэратура паветра 11	12	13	14	15	16	17	18	19	20	—	Сярэдняя	Нормальн.	Максым.	Мінімальн.	Чысло, калі нагл. мін.
(Базерны)	2	Дрыса . .	2	4	8	3	0	3	0	2	3	3	—	3	—	14	—	—
	3	Полацак . .	2	4	8	2	0	2	1	1	3	3	—	3	5	14	—1	15
	68	Гарадок . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	7	Нова-Каралёва . . .	2	5	8	2	—1	1	0	1	2	2	—	2	4	14	—6	18
(Вадападзельны)	8	Лепель . .	2	3	8	2	0	1	0	0	2	4	—	2	—	14	—3	18
	15	Сянно . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	70	Бобр . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	13	Барысаў . .	2	4	7	3	0	2	0	1	2	4	—	3	5	14	—3	12
	16	Менск . .	1	4	7	2	1	1	0	1	1	4	—	2	6	12	—2	16
	93	Бярэзіна . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	23	Мар'іна-Горка	2	4	7	2	1	1	0	1	1	5	—	2	6	12	—	—
	25	Асіпавічы . .	3	5	8	3	0	2	0	2	2	4	—	3	6	15	—2	12
	10	Ворша .	1	4	9	3	0	1	0	1	2	4	—	2	5	11	—3	16
	19	Горкі . . .	1	4	8	3	0	2	0	0	1	4	—	2	5	14	—4	12
(Раўніны)	89	Клічаў . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	28	Слуцак . .	2	5	6	3	1	1	0	1	1	4	—	2	—	11	—2	18
	119	Ратміравічы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар.-Сосны .	1	5	6	3	1	2	0	1	2	4	—	3	9	12	—2	12
	21	Магілеў . .	2	5	9	3	0	2	1	1	1	3	—	3	5	15	—3	16
	73	Чавусы .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў .	2	6	9	3	1	3	1	1	1	4	—	3	5	15	—2	16
	171	Касьцюковічы . .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск . .	2	6	8	4	2	2	1	1	2	3	—	3	6	14	—1	12
	32	Жлобін . .	2	6	8	5	1	3	1	2	2	5	—	3	6	15	—2	16
(Нізіны)	33	Жыткавічы .	1	5	7	4	2	2	1	1	2	4	—	3	10	13	—2	12
	37	Калінкавічы .	2	6	8	4	1	3	1	1	3	4	—	3	7	13	—2	18
	39	Лельчыцы . .	1	6	7	4	1	2	1	0	2	3	—	3	—	15	—2	—
	85	Чачэрск .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба . .	3	7	10	4	1	2	1	1	2	4	—	4	—	16	—2	16
	38	Гомель . .	3	7	10	4	1	3	1	1	2	4	—	4	6	16	—1	16
	35	Васілевічы .	2	6	8	4	1	3	0	1	2	4	—	3	7	14	—1	12
	40	Людвінава .	3	7	8	5	2	4	1	1	3	5	—	4	10	13	—2	20
	242	Красілаўка .	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

назіраньняў за 11—20 красавіка 1933 г.

Адносная вільготн. паветра за 13 г. у %	Тэмпэратура паверхні глебы			Ападкі ў мм												Мэтэоролёгічная зьява (у дужках адзначаны числы)
	Макс.	Мінім.	Чысло, калі на гл. мін.	11	12	13	14	15	16	17	18	19	20		Сума	
74	—	—	—	..	..	..	3.0	..	1.0	1.0	7.0	1.0	..	—	13.0	—
72	—	—	—	..	..	2.0	5.0	..	4.0	0.5	6.0	3.0	..	—	20.5	туман (19)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	0.2	..	..	4.0	..	4.0	4.0	4.0	3.0	..	—	19.2	—
47	21	—8	16	..	..	..	6.0	..	6.0	6.0	7.0	..	..	—	25.0	туман (19)
80	—	—	—	..	..	..	1.0	1.0	1.0	1.0	0.1	2.0	3.0	—	9.1	туман (11)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
—	—	—	—	..	..	2.0	6.0	0.1	2.0	0.1	4.0	0.1	1.0	—	15.3	туман (19, 20)
—	—	—	—	2.0	..	0.2	2.0	6.0	5.0	2.0	5.0	0.4	1.0	—	23.6	—
73	—	—	—	..	..	2.0	4.0	..	5.0	1.0	5.0	0.2	4.0	—	21.2	град (20)
69	20	—2	11	..	0.1	2.0	5.0	0.2	5.0	1.0	1.0	0.2	..	—	14.5	град (14)
—	—	—	—	..	..	..	0.2	..	7.0	1.0	0.6	8.0	0.1	—	16.9	—
73	—	—	—	..	..	3.0	0.2	1.0	1.0	1.0	0.2	..	..	—	5.4	туман (12)
64	—	—	—	..	..	2.0	2.0	..	3.0	..	2.0	..	..	—	9.0	—
75	—	—6	16	0.1	..	..	7.0	0.1	7.0	3.0	6.0	0.3	1 0	—	24.5	—
76	21	—4	12	..	0.5	..	7.0	0.5	4.0	3.0	5.0	2.0	2.0	—	24.0	—
—	—	—	—	0.3	..	..	6.0	0.1	3.0	0.6	2.0	..	0.1	—	12.1	—
69	—	—	—	..	0.2	2.0	0.6	0.3	4.0	0.4	0.1	0.1	0.1	—	7.8	туман (20)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
61	20	—5	12	..	0.1	1.0	0.5	0.2	2.0	0.4	0.1	..	..	—	4.3	туман (16, 18)
72	—	—	—	..	..	..	6.0	1.0	4.0	1.0	8.0	0.1	..	—	20.1	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
68	—	—	—	0.2	..	..	3.0	0.2	5.0	1.0	8.0	0.4	..	—	17.8	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
66	29	—	—	..	..	..	3.0	..	3.0	..	1.0	..	..	—	7.0	—
64	—	—	—	..	..	..	1.0	0.1	2.0	0.1	1.0	..	..	—	4.2	—
61	—	—	—	1.0	1.0	1.0	2.0	..	4.0	2.0	..	..	..	—	11.0	—
60	—	—	—	0.1	0.4	..	3.0	0.1	2.0	0.1	..	..	..	—	5.7	бура (14, 18)
—	—	—	—	..	2.0	0.2	0.2	3.0	1.0	0.6	0.3	2.0	..	—	9.3	—
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—
77	11	—1	16	..	..	..	..	2.0	4.0	..	1.0	..	..	—	7.0	—
59	—	—	—	0.3	..	..	1.0	..	2.0	1.0	0.3	..	..	—	4.6	—
62	—	—	—	0.3	0.1	..	2.0	0.1	2.0	1.0	0.1	0.1	..	—	5.7	—
58	27	—4	20	0.2	0.1	0.1	1.0	..	2.0	3.0	0.1	..	2.0	—	8.5	бура (14, 15)
—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—	—

Табліца вынікаў мэтэоролёгіч. назіраньняў за 11—20 красавіка 1933 г.

Кліматычны раён	№№ па карце	Назва станцый	Вецер: Пераважаючы — Напрамак	Вецер: Пераважаючы — Хуткасьць	Вецер: З максым. хуткасьцю — Напрамак	Вецер: З максым. хуткасьцю — Хуткасьць	Інсоляцыя ў %%	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме — Агульная	Сярэдняя воблачнасьць у 10-балавай сыстэме — Ніжняя	Сярэдні стан павярхоўага пласту глебы (на глыбіні 10—15 см)
I Паўночны (Вазёрны)	2	Дрыса	NW	4	—	—	—	8	8	мокрая
	3	Полацак	W	4	S	9	—	8	8	"
	68	Гарадок	—	—	—	—	—	—	—	—
	84	Сураж	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	7	Нова-Каралёва	W	4	N	14	24	8	8	мокрая
II Пераходны (Вадападзельны)	8	Лепель	NW	4	NW	12	—	5	5	мокрая
	15	Сянно	—	—	—	—	—	—	—	—
	75	Плешчаніцы	—	—	—	—	—	—	—	мокрая
	70	Бобр	—	—	—	—	—	—	—	"
	13	Барысаў	SW	4	W	9	—	8	8	"
	16	Менск	W	4	NW	12	—	8	8	вільготная
	93	Бярэзіна	—	—	—	—	—	—	—	"
	23	Мар'іна-Горка	W	6	W	12	—	8	8	мокрая
	25	Асіпавічы	W	9	W	12	—	9	9	вільготная
	10	Ворша	N	4	NW	6	—	8	8	мокрая
	19	Горкі	W	8	NW	9	—	8	8	"
III Цэнтральны (Раўнінны)	89	Клічаў	—	—	—	—	—	—	—	вільготная
	28	Слуцак	NW	6	NW	12	—	8	8	—
	119	Ратміравічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	30	Мар'іна-Сосны	W	4	W	12	—	8	8	вільготная
	21	Магілеў	W	6	W	21	—	8	8	мокрая
	73	Чавусы	—	—	—	—	—	—	—	—
	27	Чэрыкаў	W	4	W	12	—	8	8	мокрая
	71	Касьцюковічы	—	—	—	—	—	—	—	—
	31	Турск	W	4	W	9	28	8	8	мокрая
	32	Жлобін	N	6	E	9	—	8	5	вільготная
IV Паўднёвы (Нізінны)	33	Жыткавічы	W	4	W	9	—	8	8	"
	37	Калінкавічы	W	4	W	15	—	8	8	"
	39	Лельчыцы	—	—	—	—	—	—	—	"
	85	Чачэрск	—	—	—	—	—	—	—	—
	83	Барба	E	4	NW	12	—	8	8	вільготная
	38	Гомель	W	4	W	9	—	8	8	"
	35	Васілевічы	SW	4	NW	9	21	8	8	"
	40	Людвінава	W	4	NW	15	—	9	9	"
	242	Красілаўка	—	—	—	—	—	—	—	—

ходзіў з захада па пэрыфэрыі Заходня-Эўропейскага антыцыклёну. Гэты струмень падтрымліваў рух цыклёну на поўначы Эўропейскай тэрыторыі Саюза на Урал.

У канцы наступнага дня ў тыл другога цыклёну, які пасунуўся на Фінскую затоку, прарваліся марскія арктычныя масы, ахапляючы Прыбалтыку і БССР. 4-га ліку на Рыскай затоцы знаходзіцца новы цыклён, які злучаецца з папярэднім і стварае дэпрэсію над верхавінамі Дняпра і Зах. Дзьвіны.

Шэраг фронтальных падзелаў, зьвязаных з гэтай дэпрэсіяй, выклікае на тэрыторыі БССР з 3-га па 5-ае значныя ападкі пераважна ў выглядзе сьнегу. З мешанінай розных мас досыць неаднолькавых у тэмпэратурных адносінах зьвязваецца ўтварэньне туманаў у цэнтральных частках дэпрэсыі, якія 5-га ліку наглядаліся амаль па ўсёй тэрыторыі БССР.

К 6-му цэнтр дэпрэсыі прасоўваецца на нізавіны Дняпра, адчыняючы шлях для далейшага руху праз краіну халодных, марскіх арктычных мас. Такі паўночны струмень захоўваецца да канца дэкады, ствараючы зацяжное пахаладаньне.

З пачатку другой дэкады красавіка на поўначы і паўночным усходзе Эўропейскай тэрыторыі Саюза вызначаецца процэс антыцыклёногэнеза ў контынэнтальна-полярным паветры.

Намнажэньне гэтага паветра ў дадзеных раёнах адбывалася ў канцы папярэдняй дэкады з паўднёвага ўсходу ў сувязі з цыклёнічнымі ўмовамі адзначанай дэкады.

Процэс антыцыклёногэнэза на паўночным усходзе ствараецца раўналежна затуханьню дэпрэсыі, якая засталася ад папярэдняй дэкады і ссунулася на паўднёвы захад.

Нарэшце, 13-га ўся Эўропейская тэрыторыя Саюза аказваецца ў вобласьці абшырнага антыцыклёну. Контынэнтальна-полярныя масы, якія складаюць гэтую вобласьць, амаль не ствараюць воблачнага насьцілу, у выніку чаго ў паўдзённыя гадзіны паветра значна награваецца.

Але з наступнага дня антыцыклён пачаў хутка разбурацца. Адначасна з захаду праз Скандынавію на Барэнцава мора адбываецца рух першага цыклёну новай фронтальна-полярнай сэрыі.

Зьвязаны з гэтым цыклёнам фронт оклюзыі 14-га пасоўваецца на заходнія часткі Эўрапейскай тэрыторыі Саюза, выклікаючы ападкі. Сьледам адбываецца пранікальне праз Балтыку новых мас марскога арктычнага паветра, якое ахапляе заходнія часткі Эўрапейскай тэрыторыі Саюза.

Наступны цыклён той-жа полярна-франтовай сэрыі, таксама ўжо оклюдыраваны, уваходзіць 16-га на Балтыцкае мора, ствараючы лагчыну на левабярэжную частку УССР. Адначасна з Каспійскага мора на цэнтральныя раёны Эўрапейскай тэрыторыі Саюза прасоўваецца паўднёва-ўсходняя дэпрэсыя.

У наступны дзень у выніку злучэньня абедзьвюх цыклёнічных вобласьцяй над Эўрапейскай тэрыторыяй наглядаецца абшырная дэпрэсыя з цэнтрам каля Масквы. У сувязі з рухам цэнтра ў паўночна-заходнім напрамку і стварэньнем вобласьці высокага ціску ў Нарвэскім моры, адбывалася павялічэньне барычнага градыенту ў заходнім сэктары дэпрэсыі. Гэта стварыла ўмовы для моцнай штармавой дзейнасьці ў басэйне Дняпра, што наглядалася 18-га ліку.

На працягу апошніх дзён дэкады дэпрэсыя пачала запаўняцца і наогул ссоўвацца на ўсход, вынікам чаго было паступовае аслабленьне тылавога цячэньня халодных арктычных марскіх мас у заходніх частках Саюза.

У сувязі з агульнымі процэсамі, якія адбыліся на працягу гэтае дэкады на тэрыторыі БССР, пачатак дэкады меў характар паляпшэньня стану надвор'я.

У першы дзень дэкады яшчэ наглядалася зона ападкаў, якая была зьвязана з франтамі дэпрэсыі, што засталася ад папярэдняй дэкады на паўднёвым захадзе Саюза.

Але ў наступныя два дні процэс антыцыклёногэнэза стварае ўмовы для праясьненьняў неба і значнага награваньня паветра ўдзень.

Астатнія дні дэкады праходзяць ва ўмовах разьвіцьця цыклёнічнай дзейнасьці, у выніку якой, як і ў папярэдняй дэкадзе, тэрыторыю краіны ізноў займалі марскія арктычныя масы.

Утварэньне і прасоўваньне франтоў, зьвязаных з дэпрэсыяй, надала другой палове дэкады характар няўстойлівага надвор'я з частымі ападкамі. 18-га ліку на тэрыторыі краіны адбылася штармавая дзейнасьць.

Л. Садоўскі.

МЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА

за 11-20 красавіка 1933 г.

Тэмпэратура ў гэту дэкаду трымалася наогул ненормальна нізкая. Спачатку т-ра павышалася і 13-га дасягнула 7—10°, але зараз-жа зьнізілася да 0—1° і заставалася такой нізкай да канца дэкады. Толькі ў апошні дзень ізноў наглядалася некаторае падвышэньне да 3—5°. Сярэдняя дэкадная т-ра хісталася ад 2 да 4°, і такім чынам, у паўночнай палове БССР была на 2—3° ніжэй нормальнай т-ры, а ў паўднёвай адхіленьне даходзіла нават да 7°. Максымальная т-ра хісталася ад 12 да 16°, мінімальная—ад —1 да —4°.

Па выпадзеньні ападкаў БССР можна падзяліць на наступныя часткі: паўночна-ўсходнюю, якая абмежавана лініяй Полацак—Барысаў—Магілеў, дзе ападкаў выпала вялікая колькасьць —да 20—25 мм. Далей ад гэтай мяжы колькасьць ападкаў паступова зьмяншаецца і мейсцамі на поўдні дасягае 4—5 мм, зусім нязначнай колькасьці.

На працягу дэкады ападкі разьмяркоўваліся наступным чынам: галоўная маса іх выпала 14-га, 16-га і 18-га, калі сутачныя сумы перавышалі 5 мм, у астатнія-ж дні ападкі, калі і выпадалі, дык нязначныя. Выпадалі ападкі як у выглядзе дажджу, так і ў выглядзе сьнегу, які тут-жа раставаў.

Вятры пераважалі заходнія з сярэднімі хуткасьцямі ад умераных да сьвежых, максымальныя-ж хуткасьці былі вельмі значныя і хісталіся ад 9 да 20 м/сэк.

Воблачнасьць складала 80% агульнага пакрыцьця неба, сонечнае зьзяньне 21—28% ад магчымага.

Н. Малішэўская.

С/Г. ГІДРОМЭТЭОРОЛЁГІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА.

Сытуацыя гідромэтэоролёгічнага рэжыму, якая складвалася на працягу другой дэкады красавіка, у асноўным не перашкаджала нормальнаму разгортваньню веснавых палявых падрыхтоўчых работ, а таксама і сяўбе.

Для некаторых палявых работ, як, напр., вывазка гною, умовы надвор'я зусім ніякіх перашкод не стваралі па ўсёй тэрыторыі.

Тэмпэратурны рэжым хоць і быў ніжэй нормы па ўсёй рэспубліцы (сярэдняя за дэкаду 2—4°), дазволіў вытвараць усе палявыя работы, нават і пасеў раньніх зернавых, так як лішкаў вільгаці ў глебе к гэтаму моманту ўжо ня было. і толькі на поўначы БССР ападкі, якія выпадалі амаль штодзённа, некалькі тармазілі разгортваньне работ.

У лепшых гідромэтэоролёгічных умовах знаходзілася паўднёвая частка ад лініі Слуцак—Рагачэў, дзе магчыма было вытвараць усе с/г. палявыя работы і сеў на працягу ўсёй дэкады. Праўда, тут таксама выпадалі ападкі амаль штодзённа, але ў такой нязначнай колькасьці пераважна ў дзесятых долях мілімэтра, часткова 1—2 мм, і толькі 16-га красавіка выпала ад 2 да 4 мм.

Становішча азімых не магло пагоршыцца ад умоў надвор'я. Мінімумы, якія наглядаліся 16-га красавіка, у паўночнай частцы ад —6 да —8° (—8° адзначана на мэтст. Новае-Каралева Лёзьнянскага раёну і —6° Ворша) таксама не маглі адмоўна адбіцца на азімых, так як вэгэтацыя апошніх яшчэ не пачалася, і выхад іх з зімы увогуле добры. Для звышраньніх пасеваў пагрозы таксама ня было.

Ф. Рабаконь.

ВЫНІКІ КОНКУРСУ ПА ЗБОРЫ РАЦПРАПАНОЎ.

11 красавіка адбылося пасяджэньне камісіі па разгляду і ацэнцы рацпрапаноў, што паступілі на конкурс, які праводзіўся групай вынаходніцтва і рацыяналізацыі Гімэіну сумесна з вытворчым сэктарам МК у студзені—лютым 1933 г.

Усяго на конкурс было падана 17 прапаноў ад 8 аўтараў, прычым на аднаго аўтара прыходзілася ад 1 да 6 прапаноў. З усіх паступіўшых прапаноў прынята 4, адхілена 7 і патрабуюць далейшай прапрацоўкі—6.

Такі вялікі процант адхіленых прапаноў тлумачыцца недастаткова ўважлівымі адносінамі аўтараў да дасканалай прапрацоўкі падаваемых матар'ялаў, а таксама неконкрэтызаванасьцю паасобных прапаноў.

Частка аўтараў зусім неправідлова зразумела задачы конкурсу і падавала няжыцьцёвыя прапановы, што прадугледжваюць скарыстаньне такіх востра-дэфіцытных матар'ялаў, як жалезабэтон (Кузьмічэнка).

Былі прапановы і проста заснаваныя на недарэчнасьцях, як, напр., прапанова аб кажуху для дажджамеру, для захопу касых ападкаў, што прывяло-б да простага скажэньня ўсіхназіраньняў.

Разам з тым маецца і некалькі надта цікавых прапаноў (Лагацкі, Васільчанка, Ліўшыц Я. Л, Лагачоў), якія патрабуюць, каб на іх каротка застанавіцца.

Так, напрыклад, дзякуючы прапанове т. Лагацкага (мэтстанцыя Асіповічы), які прапанаваў просты і дзейсны спосаб прымацаваньня крышкі да дажджамернага вядра, павінна палегчыцца як праца назіральніка, так і якасьць назіраньняў над атмосфэрнымі ападкамі. Зараз па гэтай прапанове ўжо зроблены рысункі, напісан тэкст, і яна ў бліжэйшым часе павінна быць праведзена на ўсіх мэтстанцыях БССР.

Тав. Лагацкі прэміяваны ў суме 50 руб.

Дзьве каштоўных і цікавых прапановы ўнёс тав. Васільчанка (мэтстанцыя Горкі). Першая яго прапанова, якая заключаецца ў прыстасаваньні зусім простага, але надта дзейснага дэмпфэра (успакаіцеля) да омбрографа Рорданца надзвычайна павялічвае якасьць запісу на ленце, што, акрамя простай карысьці ў сэнсе палягчэньня і паскарэньня апрацоўкі матар'ялаў, адначасова павялічвае і дакладнасьць назіраньняў.

Прылада ўстаноўлена на мэтстанцыі Горкі аўтарам прапановы і дала вельмі станоўчыя вынікі.

Мяркуецца падаць у Камітэт па вынаходніцтву пры СТО СССР заяўку на выдачу аўтарскага пасьведчаньня на гэта вынаходніцтва.

Другая прапанова т. Васільчанка дае канструкцыю дажджамера для цьвёрдых ападкаў, з цыліндрычнаю ўнутранаю заховаю, якая захоўвае ападкі ад выдуваньня паветровымі патокамі і завіхрэньнямі, што ўтвараюцца ў вядры дажджамеру.

Такі дажджамер нарыхтаваны майстэрняй Гімэіну і зараз выпрабоўваецца на мэтстанцыі Горкі, і пасьля атрыманьня параўнаўчых матар'ялаў будзе вынесена канчатковае рашэньне аб гэтым дажджамеры.

Тав. Васільчанка прэміяван у суме 100 руб.

Па колькасьці паданых прапаноў неабходна адзначыць т. Ліўшыца Я. Л. (Бюро Воднага Кадастру), які унёс 6 прапаноў. Нажаль, ня ўсе прапановы т. Ліўшыца Я. Л. былі дастаткова прапрацаваны, у выніку чаго значны процант іх быў адхілены. Згодна п. 6 умоў конкурсу, якія апублікованы ў № 42/114 дэкаднага бюлетэню Гімэіну ад 21/XII-32 г. т. Ліўшыц прэміяваны заахвочвальнай прэміяй у памеры 50 руб.

Паасобна патрэбна адзначыць працу студ-практыканта т. Лагачова А. А., які прапанаваў прыладу для вымеру ўзроўню грунтовых вод. Гэтую прыладу мяркуецца ўдасканаліць, вырабіць і выпрабаваць у натуры.

Падводзячы вынікі ўсяму конкурсу, неабходна констатаваць, што галоўная мэта конкурсу—максымальнае разварушэньне работнікаў АГМС і ўцягненьне іх у рацыяналізатарскую работу поўнасьцю не дасягнута, але побач з гэтым конкурс паказаў, што пэўны зрух у гэтым напрамку ўжо намеціўся, і зараз задача заключаецца ў тым, каб узначаліць гэты рух і ўвесьці яго ў плянавае рэчышча.

Другі вывад, які неабходна зрабіць, падводзячы вынікі конкурсу —гэта тое, што надалей неабходна надаць больш увагі даскана-

лай прапрацоўцы прапаноў з тым, каб узьняць якасьць іх і зьменшыць процант адхіленьня. Задача рацыяналізатараў-вынаходнікаў АГМС дабіцца такога становішча, каб зьвесьці процант адхіленьняў прапаноў да мінімуму.

Зроблены, магчыма сказаць, першыя нясьмелыя крокі ў галіне вынаходніцтва і рацыяналізацыі па службе АГМС у БССР.

Адна з асноўных задач другой пяцігодкі, якая пастаўлена Пленумам ЦК УсеКП(б)—асваеньне тэхнікі—накладае на ўсіх работнікаў АГМС асабліва вялікія абавязкі ўнесьці сваю долю творчае дзейнасьці на карысьць пераможнага соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР.

Конкурс паказаў, што ў гэтай справе ў нас ёсьць зусім сур'ёзныя недахопы. Дасягненьні-ж, якія маюцца, далёка ня могуць нас задаволіць, але яны ўсё-ж кажуць аб бясспрэчных больш вялікіх магчымасьцях у гэтай справе. Патрабуецца толькі ўпартая праца, высокая напружанасьць, асьвядомленая высокай задачай стварэньня бяскласавага грамадзтва.

Таварышы, работнікі АГМС, узмацніце тэмпы вынаходніцтва і рацыяналізацыі, пашырце кола ўдзельнікаў у гэтай справе, падыміце якасьць гэтай працы на вышэйшую ступень!

Адказны па групе вынаходніцтва
і рацыяналізацы Гімэіну **А. Булаўка.**

Адказны рэдактар **М. Л. ЛЕЙВІКАЎ**

Менск. Друкарня БАН. Зак. № 4399. Гарліт № 1263. Тыр. 1000 экз. 9 стар.